# Беларуская пошта часова прыпыняе прыём выходных паштовых адпраўленняў ва ўсе краіны, за выключэннем Ганконга, Кітайскай Народнай Рэспубліке і Расійскай Федэрацыі

Беларуская пошта часова прыпыняе прыём выходных паштовых адпраўленняў ва ўсе краіны, за выключэннем Ганконга, Кітайскай Народнай Рэспубліке і Расійскай Федэрацыі

Паважаныя кліенты РУП "Белпошта"!

Звяртаем увагу на тое, што ў сувязі з абвешчанай пандэміяй каронавіруса (SARS / CoV-19) ва ўсім свеце авіякампаніі, якія ажыццяўляюць перавозку пошты з Рэспублікі Беларусь, з-за ўзмацнення жорсткасці глабальных мер, накіраваных на стрымліванне распаўсюджвання каронавіруса і забеспячэнне бяспекі пасажыраў падчас палёту, пастаянна карэктуюць і скарачаюць авіярэйсы ў розныя краіны. На многіх напрамках поўнасцю закрыты авіяцыйныя зносіны.

У сувязі з прыпыненнем авіяперавозак РУП «Белпошта» часова прыпыняе прыём выходных паштовых адпраўленняў (адпраўленняў пісьмовай карэспандэнцыі, пасылак і адпраўленняў EMS) ва ўсе краіны, за выключэннем Ганконга, Кітайскай Народнай Рэспублікі і Расійскай Федэрацыі.

Пералік краін будзе карэктавацца ў выпадку з'яўлення транспартных сродкаў, здольных ажыццяўляць у гэтыя краіны дастаўку.

Па паведамленнях назначаных аператараў шэрагу краін - членаў Сусветнага паштовага саюза, вынікае, што з-за карантыну, абвешчанага ў іх краінах, не хапае працуючага персаналу, таму чакаюцца сур'ёзныя затрымкі ў дастаўцы ўваходназх EMS адпраўленняў і невыкананне тэрмінаў дастаўкі адпраўленняў пісьмовай карэспандэнцыі і пасылак. Каб пазбегнуць кантакту з чалавекам, адпраўленні EMS і рэгіструемыя адпраўленні, для якіх звычайна патрабуецца подпіс адрасата, будуць дастаўляцца праз паштовыя або абаненцкія скрыні, паштаматы, без распіскі атрымальніка, а роспіс аб ўручэнні будзе прастаўляцца паштальёнам з указаннем нумара пасведчання асобы атрымальніка.

Падрабязнасці на сайце РУП "Белпошта"

---

**Source URL:** *https://xn--b1akbcqh2a7i.xn--90ais/news/19-03-2020-6098*